

# У МЕЖАХ ТЭМАТЫЧНАЙ АКЦЫІ

**КАРЭЛІЧЫ. Тэму Вялікай Айчыннай вайны закранула наша калега па пісьменніцкай арганізацыі, беларуская краязнаўца Святлана Кошур падчас сваёй творчай сустрэчы з вучнямі адной са школ райцэнтра. Мерапрыемства адбылося ў межах ужо знаёмай жыхарам рэгіёну грамадска-літаратурнай акцыі “Пад мірным небам Беларусі”, ініцыяванай Гродзенскім абласным аддзяленнем Саюза пісьменнікаў Беларусі.**

20 мая ў межах грамадска-літаратурнай акцыі “Пад мірным небам Беларусі” ў Карэліцкай сярэдняй школе № 2 выступіла член Саюза пісьменнікаў Беларусі Святлана Кошур. На сустрэчы прысутнічалі вучні 8-га і 10-га класаў.



Пісьменніца пазнаёміла школьнікаў са сваімі кнігамі, у якіх знайшла адлюстраванне тэма Вялікай Айчыннай вайны, з літаратурнымі зборнікамі “Подых часу” і “Памяти вечный огонь”, дзе змешчаны яе творы на ваенную тэму. Святлана Андрэеўна прачытала дзецям адзін з нарысаў, прысвечаны ўдзельніку Вялікай Айчыннай вайны Васілю Тананку, з якім жыла па суседству і была асабіста знаёмая.

Закрануўшы тэму гісторыі школы ў Карэлічах, Святлана Кошур расказала пра ўдзельніка Вялікай Айчыннай вайны, заслужанага настаўніка БССР, дырэктара школы Міхаіла Паўлавіча Бельскага, у час кіраўніцтва якога ў Карэлічах была пабудавана новая трохпавярховая школа. Нагадала пісьменніца і пра тых ураджэнцаў раёна, якія ў час вайны змагаліся з ворагам на розных франтах, пра подзвіг жанчын у ваенны час і лісты з фронту, якія салдацкія ўдовы, як рэліквію, захоўвалі да апошніх дзён жыцця і перадавалі дзецям.

Святлана Кошур шмат працуе ў архівах, і ўсе яе творы напісаны на добрай дакументальнай аснове. Яна не раз выступала на навуковых канферэнцыях, друкавала свае матэрыялы не толькі ў літаратурных, але і ў навуковых зборніках.

Сустрэча са школьнікамі прайшла ў цёплай сяброўскай атмасферы. Пісьменніца паабяцала дзецям, што больш падрабязна раскажа ім пра сваю творчасць і пазнаёміць з новымі творамі напярэдадні Дня беларускага пісьменства.

Святлана Валеўская

**На фота:** член Саюза пісьменнікаў Беларусі, краязнаўца Святлана Кошур падчас сустрэчы з вучнямі Карэліцкай сярэдняй школы № 2. 20 мая 2026 года.









МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

www.pisateli.by